Спецыяльны выпуск газеты для абітурыентаў

# НА ВУЧОБУ ЗАПРАШАЕ ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 17 (612) | Субота, 25 мая 1985 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## НАБЫВАЙЦЕ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

### НА ДЗЁННЫМ АДДЗЯЛЕННІ

1. Беларуская і руская мова і літаратура.
2. Руская мова і літаратура.
3. Гісторыя.
4. Матэматыка.
5. Фізіка.
6. Біялогія.
7. Гідрагеалогія і інжынерная геалогія.
8. Эканоміка працы.
9. Арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.
10. Фізічнае выхаванне.

### НА ЗАВОЧНЫМ АДДЗЯЛЕННІ

1. Беларуская і руская мова і літаратура.
2. Руская мова і літаратура.
3. Гісторыя.
4. Матэматыка.
5. Эканоміка працы.
6. Арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.
7. Біялогія.

# ШЛЯХ У ПРАФЕСІЮ

**Б. В. БОКУЦЬ,**
**рэктар ГДУ, старшыня прыёмнай камісіі, акадэмік АН БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.**

Біяграфія нашага універсітэта пачынаецца з 1-га мая 1969 года. Ён быў створаны на базе былога Гомельскага дзяржаўнага педінстытута імя В. П. Чкалава. За прайшоўшы час па ўсіх формах навучання ў яго сценах падрыхтавана звыш 17 тысяч 170 спецыялістаў. Сёлета дыпломы аб заканчэнні ГДУ атрымае яшчэ каля 1190 чалавек.

Універсітэт паспяхова прайшоў нялёгкі шлях свайго станаўлення і цяпер па праву лічыцца вядучай вышэйшай навучальнай, навуковай і культурнай установай Беларускага Палесся. Выпускаем філолагаў і гісторыкаў, фізікаў і матэматыкаў, біёлагаў і геолагаў, эканамістаў па працы, інжынераў-эканамістаў па арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі, спецыялістаў фізічнага выхавання.

Кожны факультэт мае свае добрыя традыцыі. Перадавыя пазіцыі надзейна ўтрымлівае фізічны факультэт. Для яго, першага ў рэспубліцы, Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР быў зацверджаны індывідуальны план навучання студэнтаў. Тут два патокі: вытворчы і педагагічны. Атрымаўшыя дыплом на першым з іх, накіроўваюцца на працу пераважна на буйнейшыя прадпрыемствы Гомеля і вобласці, другім — у сістэму народнай асветы.

З кожным годам расце навуковы патэнцыял універсітэта. Нагадаем, што ў год яго адкрыцця тут працавала 252 выкладчыкі. Толькі 73 з іх мелі вучоныя ступені і званні. Цяпер вучэбна-выхаваўчы працэс ажыццяўляюць 43 кафедры. На іх працуе 414 чалавек, сярод якіх 207 кандыдатаў, дацэнтаў і 18 дактароў навук, прафесараў. Колькасць вучоных ва універсітэце прыкметна расце. У бягучай пяцігодцы кандыдацкія дысертацыі абаранілі 54 аспіранты і маладыя выкладчыкі. Абаронена таксама 3 доктарскія дысертацыі.

Наш універсітэт як вядучая навучальная ўстанова свайго рэгіёна дапамагае камплектаваць высокакваліфікаванымі кадрамі ВНУ Гомельшчыны. За апошнія гады былі рэкамендаваны і выбраны на пасады загадчыкаў кафедр, дацэнтаў і старшых выкладчыкаў Гомельскага політэхнічнага і кааператыўнага інстытутаў, Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту і Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута каля 20 супрацоўнікаў ГДУ.

З увядзеннем у школьную праграму новага курса па інфарматыцы і вылічальнай тэхніцы нашаму універсітэту сёлета даручана правесці вялікую работу па падрыхтоўцы да яго выкладання матэматыкаў і фізікаў усіх школ Гомельшчыны. Многае робіцца для паглыблення ведаў па вылічальнай тэхніцы і саміх студэнтаў.

Ва універсітэце прыкладаюцца вялікія намаганні для няўхільнага павышэння якасці вучэбнага працэсу і кваліфікацыі выпускаемых спецыялістаў. Паспяховасць студэнтаў дасягае 93%. Вялікая ўвага цяпер надаецца ўзмоцненай метадычнай дапамозе кафедрам, ажыццяўленню сістэматычнага і больш дзейснага кантролю за іх работай.

Істотным сродкам павышэння ролі кафедр ва ўдасканальванні вучэбнага працэсу і ўмацаванні сувязі навучання з жыццём з'явіліся іх філіялы ў навукова-даследчых інстытутах Акадэміі навук БССР і на прамысловых прадпрыемствах. На гэтай аснове ўдалося ўстанавіць трывалыя кантакты выкладчыкаў універсітэта з вядучымі вучонымі рэспублікі, з вопытнымі работнікамі вытворчасці і пастаянна атрымліваць інфармацыю аб навейшых дасягненнях і праблемах далейшага навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Павышэнне навуковай кваліфікацыі выкладчыкаў прыкметна ўздзейнічае на эфектыўнасць навуковых даследаванняў. Намі ўзяты курс на вырашэнне найбольш важных навукова-тэхнічных, сацыяльных і эканамічных праблем для народнай гаспадаркі. Працягваюць пашырацца і ўмацоўвацца сувязі універсітэта з вытворчасцю: ствараюцца вучэбна-навукова-вытворчыя аб'яднанні, галіновыя лабараторыі, павялічваецца аб'ём гаспадарча-дагаворных навукова-даследчых работ. Да іх выканання, пачынаючы з першага курса, актыўна далучаюцца і студэнты. Больш 90% іх плённа працуюць у разнастайных гуртках, студэнцкіх навукова-даследчых лабараторыях і ў канструктарскіх бюро. Яны з'яўляюцца сааўтарамі шматлікіх навуковых публікацый і вынаходніцтваў. Кожная трэцяя абароненая выпускнікамі ГДУ дыпломная работа цяпер рэкамендуецца дзяржаўнымі экзаменацыйнымі камісіямі да ўкаранення або публікацыі.

З кожным годам паляпшаецца матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта. Ён мае багатую бібліятэку, санаторый-прафілакторый, амаль усе студэнты, якія маюць патрэбу ў жыллі, забяспечаны інтэрнатамі. Іх у нас чатыры, два — кватэрнага тыпу. Прафсаюзны камітэт студэнтаў умела арганізоўвае іх працу, быт і адпачынак. Сёлета ў другі раз запар ГДУ прызнаны адным з пераможцаў Усесаюзнага агляду-конкурсу на лепшую арганізацыю працы, быту і адпачынку студэнтаў, за што ўдастоены Дыплома ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў і Мінвуза СССР, а таксама грашовай прэміі.

У бліжэйшай перспектыве — узвядзенне шматпавярховага корпуса фізічнага факультэта, на які ўжо распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя.

Студэнты ўсіх курсаў і факультэтаў жывуць цікавым, насычаным жыццём. Сярод іх нямала выдатных спартсменаў, якія дастойна абараняюць гонар нашай ВНУ на самых разнастайных спаборніцтвах. Лепшыя з лепшых выступалі на Спартакіядах народаў СССР, чэмпіянатах Еўропы і свету, Алімпійскіх гульнях. За высокія спартыўныя дасягненні студэнт факультэта фізвыхавання заслужаны майстар спорту СССР Віктар Пусеў, які зараз праходзіць службу ў радах Савецкай Арміі, узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Выдатныя традыцыі мае наша камсамольская арганізацыя ў студэнцкім будаўнічым руху. Неаднаразова зводны СБА ГДУ выходзіў пераможцам абласнога і рэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва. Ветэраны і актывісты будаўнічых атрадаў удастоены высокіх урадавых узнагарод, Ганаровых грамат цэнтральных органаў камсамола.

Студэнты універсітэта маюць усе магчымасці для развіцця сваіх талентаў у гуртках мастацкай самадзейнасці, якія працуюць пры студэнцкім клубе «Маладосць». Асабліва шырокую папулярнасць набыў студэнцкі тэатр. Гэтымі днямі яму прысвоена ганаровае званне народнага.

Набліжаецца да завяршэння навучальны год. Сёлетнія выпускнікі ўжо размеркаваны на будучыя месцы працы. Дыпломы ГДУ будуць выдадзены 651 маладому спецыялісту. Яны раз'едуцца па ўсіх абласцях Беларусі, некаторыя адправяцца далёка за яе межы. Мы перакананы, што на выпускнікоў 1985 года, якія набылі веды ў нашым універсітэце, як і раней, будуць прыходзіць удзячныя водзывы.

На месца тых, хто сёлета развітаецца з ГДУ, прыйдзе новае папаўненне. На наступны навучальны год планам прадугледжана набраць 675 першакурснікаў. Няхай стануць імі самыя падрыхтаваныя абітурыенты, якія заўжды і ва ўсім будуць высока трымаць марку ГДУ.





